Ірына Казакова

ПРЫКМЕТЫ І ПАВЕР'І МАГІЛЁЎШЧЫНЫ

Беларускі фальклор найлепш захаваўся ў параўнанні з фальклорам многіх іншых еўрапейскіх народаў, у якіх амаль зніклі формы яго аўтэнтычнага бытавання яшчэ ў мінулыя эпохі, а адраджаліся яны пераважна ў перапрацоўках. Беларускі народ па праву можа ганарыцца багаццем зместу, дасканаласцю мастацкай формы і разнастайнасцю жанраў свайго фальклору.

Кожны этнас мае закладзеную ў яго свядомасці і падсвядомасці выяву свету, якая залежыць ад асаблівасцей адаптыўна-адаптацыйных працэсаў, і, трэба думаць, па свайму глыбіннаму зместу застаецца нязменнай на працягу ўсяго жыцця этнасу. Але як і наколькі гэтая выява свету можа мадыфікавацца ў залежнасці ад канкрэтных гістарычных і сацыякультурных умоў жыццядзейнасці? Каб адказаць на гэтае пытанне, неабходна рэканструяваць глыбінны, амаль нязменны змест этнічнай свядомасці і зразумець, якімі могуць быць формы яго выражэння, адэкватныя гэтаму зместу, вызначыць асноўныя рысы этнічнай псіхалогіі. Рэканструяваць свядомасць і псіхалогію этнасу дапамагаюць рэшткі старажытнага светаўспрымання, якія захаваліся менавіта ў фальклорнай спадчыне.

Цікавымі ў гэтым сэнсе з'яўляюцца народныя прыкметы і павер'і, якія запаўнялі літаральна кожны момант жыцця нашых продкаў, іх гаспадарчую дзейнасць, сямейны побыт, унутраныя перажыванні, адносіны з людзьмі, назіранні за навакольным асяроддзем, імкненне прадказаць будучыню, асвятляць невядомыя факты і з'явы, тлумачыць любыя жыццёвыя выпадкі і здарэнні.

Многія прыкметы і павер'і дайшлі да нашых дзён. І сёння яны не толькі захоўваюцца ў памяці старых людзей, але шырока бытуюць у некаторых рэгіёнах Беларусі. Паказальнай у гэтым сэнсе з'яўляецца Магілёўшчына, дзе захавалася багатая фальклорная спадчына. Асаблівую каштоўнасць гэты рэгіён уяўляе ў плане даследавання сямейнай абраднасці, малых жанраў фальклору і асабліва прыкмет і павер'яў, прысвечаных гаспадарчай дзейнасці, пасеву хлеба, збору ўраджаю і, безумоўна, прадказанню надвор'я, бо ўся земляробча-гаспадарчая дзейнасць сялян залежала ад гэтага.

Вясковыя гаспадары гавораць, што нельга нарыхтоўваць на доўгае захаванне мяса і сала ў час поўні, бо яно хутка сапсуецца. Хлеб, выпечаны ў той час, калі квітнеюць злакі на корані, будзе плеснець. [*1] Такія прыкметы заснаваны на фактах. Бо сапраўды, Поўня і некаторыя іншыя нябесныя целы маюць уплыў на слаі зямной атмасферы, а разам з тым і на некаторыя прадукты харчавання, якія лёгка падвяргаюцца пашкоджанню. Так, і плесня на хлебе ўзнікае ў выніку актыўнага размнажэння ў гэты перыяд лета (пад уплывам стану атмасферы) плесневых грыбкоў. Ведаюць, што ў час цвіцення хлеба хутка псуецца віно, у гэты ж час нельга выбельваць палатно, а плямы на бялізне адмываюцца хутчэй.

Яшчэ адно цікавае павер’е з жыццёва-практычных назіранняў сялян: калі збажына пачынае красаваць знізу, то збожжа будзе каштаваць танна, калі ж зверху – дорага. Іншымі словамі, здаровы і добры колас пачынае красаваць звычайна знізу, тады трэба разлічваць на добры ўраджай і, адпаведна, на танны хлеб.

Жыхары вёскі адзначаюць, калі ластаўкі лятаюць нізка, то хутка будзе дождж. І сапраўды, ластаўкі апускаюцца нізка за дробнымі насякомымі, якія перад дажджом таксама апускаюцца ўніз, бо ў гэты час верхнія слаі атмасферы густа насычаны вільгаццю.

Калі сабакі пачынаюць есці траву – да дажджу, бо перад дажджом трава становіцца для іх самай карыснай у плане насычэння спецыфічнымі мікраэлементамі.

Ёсць прыкметы па самых розных з’явах. Напрыклад, калі ў першую навальніцу грыміць гром – гэта да навальнічнага лета. Гром зімой – да моцнага ветру і адлігі; маланка зімой – да буры. Кола навокал месяца – да ветру. Калі месяц акружаны ясным колам, якое становіцца ўсё больш шырокім, то будзе яснае надвор’е. Тусклы месяц – да мокрага надвор’я. Зорка з хвастом (камета) прадказвае якую-небудзь важную падзею. Калі вакол сонца з’яўляюцца кругі – гэта прадказвае няшчасце. Чырвонае сонца – да ветру, чырвонае сонца ўзімку – да марозу. Добрай прыкметай лічыцца глядзець на вясёлку. Дождж на другі дзень вяселля прадказвае шчаслівы і пладавіты шлюб.

Існавалі некаторыя прыкметы па раслінах: калі на дубах шмат жалудоў – гэта прадказвала халодную зіму і добрую ўрадлівасць на наступны год. Рана расквітнеўшая вольха прадвяшчае мокрае лета; ураджай арэхаў – да ўраджаю хлеба на будучы год. Ураджай рабіны – да цяжкага года.

Былі прыкметы і па неадухаўлёных прадметах. Напрыклад, нельга было дарыць нож, іголкі і булаўкі – будзе сварка. Дзверы скрыпяць – да непрыемнасцей у доме. Дровы трашчаць – да марозу. Калі штосьці падае з рук (лыжка, відэлец, нож), а таксама іскрынка з печы – да госця. Вельмі дрэннай прыкметай лічыцца разбіць люстэрка. Нельга вітацца і цалавацца праз парог – будзе сварка. Сварку прадказвае і рассыпаная соль. Нельга месці ў адной хаце рознымі венікамі, інакш разыдзецца ўсё багацце. Чырвоны агонь у печы – да марозу, бледны – да адлігі. Выпадкова апрануць што-небудзь навыварат – быць бітым. Калі каму-небудзь у ежу трапіць вугалёк – да багатага падарунка. Дрэннай прыкметай лічыцца, калі хлеб вылезе з печы і г. д.

Існуюць прыкметы па птушках і жывёлах. Напрыклад, калі па вёсцы лятае зязюля – гэта да пажару. Пажар і іншыя няшчасці прадказвае курыца, калі яна запяе пеўнем. Добра, калі бусел саўе ў каго-небудзь на хаце гняздо – гэты чалавек будзе шчаслівы і багаты, але калі бусел, наадварот, разбурае сваё гняздо, то гаспадарам той хаты ён прадказвае бяду. Калі гусі пачынаюць падымаць лапы і хаваць пад крыло дзюбы – да марозу, калі птушкі пачынаюць вышчыпвацца – да цяпла і сонецка. Лічылі, што калі коні іржуць – да добрых навін; сустрэць на дарозе свінню – не будзе поспеху ў справах;

калі з’яўляецца шмат мышэй – да неўраджаю; кошка мыецца ці заграбае лапамі – чакаць гасцей, бегае па хаце – да сваркі; вой сабакі прадказвае гора. Калі без прычыны сабака падскоквае высока ўверх – да пажару.

Некаторыя іншыя прыкметы і павер’і на розныя выпадкі: як села сонца, нельга выносіць смецце, бо выносіцца з хаты багацце; нельга глядзець у акно да світання (дзеўка або баба праглядзіць сваю прыгажосць, а мужык – багацце); калі свярбіць правая далонь – атрымаеш грошы, калі левая – страціш іх (або завядзеш новае знаёмства); калі ў печы раптам пагасне агонь – да нечаканых гасцей; нельга класці ў печку дровы «вастрынамі» – будзе сварка; нельга біць чалавека лучынай, бо можа захварэць на сухоты; нельга стукаць ці грымець ключамі – будзе вялікая сварка; нельга пераступаць цераз каромысел – будуць сутаргі; нельга класці пражу на стол, бо «нажывеш сорак грахоў»; наогул калаўрот – прыналежнасць чарадзеек, таму нельга класці пражу на стол, дзе кладуць хлеб і соль; нельга пакідаць на стале нож, бо «нячысцікі зарэжуць», наогул стол трэба пакідаць чыста прыбраным, асабліва на ноч, каб «не раззлаваўся дамавы». У некаторых прыкметах і павер’ях змяшаліся язычніцкія і хрысціянскія погляды. Напрыклад, нельга садзіцца за стол на 13 чалавек; нельга перадаваць адзін аднаму ў час трапезы соль. Такія павер’і нагадваюць Тайную Вячэру і паводзіны Іуды-Здрадніка.

У розныя часы верылі ў існаванне вешчых і прарочых сноў, якія змяшчаюць ў сабе прадказанні лёсу чалавека, яго родзічаў і сваякоў, прадвесці якіх-небудзь падзей. Нашы продкі таксама спрабавалі прадказаць па снах хаця б самыя важныя падзеі. Нараджэнне чалавека ў снах заўсёды аказваецца пэўным чынам звязана з вадой. Верылі, што калі жанчыне сніцца, што яна п’е, налівае, разлівае ваду, альбо плавае ў любым вадаёме, мые бялізну ў рэчцы, ловіць рыбу і г. д. – усё гэта прадказвае хуткую цяжарнасць. Калі ж цяжарная жанчына бачыць падобныя сны, гэта значыць хуткія і лёгкія роды.

Некаторыя сны прадказвалі смерць. Напрыклад, калі чалавеку сніўся нябожчык з блізкіх родзічаў і клікаў яго да сябе. Калі чалавеку прысніцца труна, гэта да смерці яго бліжэйшага сябра, а калі труна вялікая па памеру – наогул да нябожчыка ў вёсцы. Калі незамужняй дзяўчыне (ці хлопцу) сніцца вяселле, гэта значыць, што яна (ён) можа памерці да шлюбу. Лічаць, што да смерці сніцца царква, чорныя харугвы, свечкі, абразы, выкапаная магіла, белая свіння, ссечанае дрэва, збіранне ў дальнюю дарогу і інш.

Да шлюбу сніцца мост і пераход праз яго з будучым супругам, каравай, ручнікі, пярсцёнак. Калі дзяўчына бачыць у сне каласістую ніву або проста шмат збожжа, гэта азначае шчаслівае замужжа і багацце, а таксама, што ў яе будзе многа дзяцей. Хлопцу да шлюбу сніцца конь і запрэжкі.

Наогул, шмат прыкмет і павер’яў звязана з сямейна-абрадавым цыклам. Гэта натуральна, таму што сямейныя абрады адлюстроўвалі самыя важныя, пераломныя моманты чалавечага жыцця. Так, шмат забарон, абмежаванняў, прыкмет і павер’яў было звязана з паводзінамі цяжарнай жанчыны. Ёй нельга было, напрыклад, займацца ніякай справай (акрамя прыгатавання ежы і прыбірання хаты) у час Каляд і ў іншыя святочныя дні (у нядзелю, на Св.

Духа, Тройцу, Вялікдзень, тыдзень пасля Вялікадня). Лічылася, што калі ў такі недазволены час жанчына, напрыклад, прышые гузікі да кашулі і нехта гэта ўбачыць, тады дзіця абавязкова народзіцца з «гузікам» (бародаўкай) на твары або на вуху. Калі ж на свята жанчына прасуе кашулю і нехта гэта бачыць, то ў дзіцяці будзе ўвесь бок чырвоны. Інфарматары паведамляюць, што такія выпадкі мелі месца на самай справе. Некаторыя з такіх забарон былі заснаваны на жыццёвым вопыце і мелі практычны характар.

З нованароджаным было звязана таксама многа прыкмет. Напрыклад, верылі, што калі перад родамі жонкі ў мужа свярбяць вушы, тады ў яго народзіцца сын. Лічылася, што той, хто нарадзіўся ў новы месяц, будзе доўга жыць. Верылі што калі нованароджанаму хлопчыку пакласці ў рот печаны яблык, тады ён не будзе «падкі да гарэлкі». Верылі таксама, што шчаслівай будзе дачка, калі яна падобная на бацьку, і сын, калі ён падобны на маці. Лічылі, што маленькаму дзіцяці нельга падносіць люстэрка, інакш ён будзе палахлівы і не будзе доўга гаварыць. Калі ў нованароджанага адвальваўся пупочак, маці павінна была захоўваць яго да той пары, пакуль дзіця не пачне разумець і хадзіць. Маці павінна даць яму пагуляць гэтым пупочкам, каб ён яго развязаў, тады дзяця будзе вельмі разумным. Пасля маці закідвала пупок у гумно або на двор заможнага гаспадара, каб дзіця было багатым.

І вясельны, і пахавальны абрады таксама пачыналі рознымі прыкметамі і павер’ямі; іх вялікая колькасць, бо людзі, як маглі, хацелі прадказаць і замацаваць будучы шчаслівы лёс нованароджанага і новай сям’і, з належнай павагай пахаваць і памянуць нябожчыка, адвесці беды і няшчасці.

Народныя веды, назапашаныя ў пакаленнях, якія перадаваліся ў спадчыну нашчадкам праз прыкметы і павер’і, дапамагалі правільна арыентавацца ў з’явах прыроды, заўважаць яе знакі, падказкі. На такіх уяўленнях, вераваннях, павер’ях будавалася народная этыка, эстэтыка, філасофія, закладваліся асновы этнічнай свядомасці і этнапсіхалогіі.

ЗАЎВАГІ

*1. Усе прыклады ўзяты з уласнага архіва аўтара. Яны былі запісаны ў вёсках Хоцімскага раёна Магілёўскай вобласці.